
Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!
ФРАНЦІШАК БАГУШЭВІЧ



Наша слова




Газета выходзіць з сакавіка 1990 года | № 40(374) | 14 КАСТРЫЧНКА 1998 г.

19 кастрычніка Беларускаму Народнаму Фронту “Адраджэньне” 10 гадоў



Сакратарыят ТБМ імя Францішка Скарыны і рэдакцыя газеты “Наша слова” віншуюць Беларускі Народны Фронт “Адраджэньне” з 10 - годдзем. У свой час Таварыства Беларускай Мовы прыклала свае сілы дзеля станаўлення Фронту. Дзякуючы ТБМ у Вярхоўны Савет 12-га склікання было абрана 13 дэпутатаў БНФ, у тым ліку і Зянон Пазьняк. Таму свята БНФ і наша свята. Мы ўсе - Фронт, Народны Фронт, Беларускі Фронт. Са святам усіх нас.

Надрукаваны Статут ТБМ



У выдавецтве “Белфранс” асобнай кніжачкай выйшаў “Статут Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны” ў апошняй рэдакцыі, зарэгістраваны Міністэрствам юстыцыі Рэспублікі Беларусь 24 жніўня 1998 года. Наклад 500 асобнікаў.

Да ведама першасных арганізацый ТБМ. Кожны, хто хоча набыць Статут ТБМ павінен пераслаць 25 тысяч рублёў на адрас: 220095, Менск - 95, п/с 34, Алегу Трусаву.

Дарагія сябры “Нашага слова”!

Сёння мы можам паведаміць вам вынікі падпіснoй кампаніі на чацвёрты квартал 1998 года. Сакратарыят ТБМ, арганізацыі ТБМ на месцах, проста актыўныя сябры Таварыства правялі не малую работу і вось вынікі:

Віцебская вобласць	Ліпень	Кастрычнік
Бешанковічы р.в.	-	3
Браслаў р.в.	5	3
Віцебск гор.	20	24
Віцебск РВПС	1	3
Верхнедзвінск р.в.	11	9
Глыбокае р.в.	7	10
Гарадок р.в.	1	2
Докшыцы р.в.	1	-
Дуброўня р.в.	2	-
Круляўшчызна	1	1
Лiёзна р.в.	-	-
Лепель р.в.	-	-
Міёры р.в.	4	4
Наваполацк гор.	8	13
Ворша гор.	2	7
Полацк гор.	20	32
Паставы р.в.	4	5
Расоны р.в.	-	-
Сянно р.в.	-	-
Талочын р.в.	-	-
Ушачы р.в.	2	-
Чашнікі р.в.	2	2
Шаркоўшчына р.в.	2	2
Шуміліна р.в.	2	1
Усяго:	**95**	**121**

Берасцейская вобласць:	Ліпень	Кастрычнік
Баранавічы р.в.	14	15
Бяроза р.в.	6	9
Белаазёрск р.в.	-	-
Бярэсце гор.	9	10
Ганцавічы р.в.	3	2
Драгічын р.в.	1	2
Жабінка р.в.	-	-
Іванава р.в.	2	1
Івацэвічы р.в.	-	3
Камянец р.в.	1	2
Кобрын гор.	2	29
Лунінец гор.	4	4
Ляхавічы р.в.	1	1
Маларыта р.в.	1	22
Пінск гор.	4	27
Пружаны р.в.	1	2
Столін р.в.	1	42
Усяго:	**50**	**171**

Гомельская вобласць	Ліпень	Кастрычнік
Буда-Кашалёва р.в.	2	4
Брагін р.в.	1	1
Ветка р.в.	1	1
Гомель гор.	38	48
Гомель РВПС	2	2
Добруш р.в.	2	2
Ельск р.в.	-	-
Жыткавічы р.в.	3	13
Жлобін гор.	3	8
Калінкавічы гор.	-	1
Карма р.в.	1	1
Лельчыцы р.в.	1	-
Лоеў р.в.	-	2
Мазыр гор.	3	2
Акцябарскі р.в.	-	1
Нароўля р.в.	-	-
Петрыкаў р.в.	2	1
Рэчыца гор.	3	6
Рагачоў гор.	2	3
Светлагорск гор.	12	15
Хойнікі р.в.	-	-
Чачэрск р.в.	2	2
Усяго:	**78**	**113**

Гарадзенская вобласць	Ліпень	Кастрычнік
Бераставіца	-	2
Ваўкавыск гор.	7	8
Воранава р.в.	3	4
Гародня гор.	35	103
Гародня РВПС	7	9
Дзятлава р.в.	6	9
Зэльва р.в.	3	1
Іўе р.в.	2	1
Карэлічы р.в.	4	5
Масты р.в.	7	9
Наваградак гор.	3	12
Астравец р.в.	2	-
Ашмяны р.в.	21	26
Смаргонь гор.	5	6
Слонім гор.	4	6
Свіслач р.в.	3	4
Шчучын р.в.	2	7
Ліда	27	30
Усяго:	**141**	**242**

Менская вобласць	Ліпень	Кастрычнік
Беразіно р.в.	2	4
Барысаў гор.	6	9
Вілейка гор.	5	8
Валожын гор.	6	8
Дзяржынск р.в.	4	2
Жодзіна гор.	6	9
Клецк р.в.	2	1
Крупкі р.в.	-	-
Капыль р.в.	-	-
Лагойск р.в.	5	8
Любань р.в.	5	11
Менск гор.	366	505
Менск РВПС	3	8
Маладэчна гор.	21	32
Мядзель	4	8
Пухавічы РВПС	7	12
Нясвіж р.в.	1	1
Смалявічы р.в.	1	1
Слуцк гор.	10	19
Салігорск гор.	7	11
Ст.Дарогі р.в.	2	3
Стоўбцы р.в.	4	4
Узда р.в.	-	1
Чэрвень р.в.	-	5
Фаніпаль	-	1
Усяго:	**471**	**671**

Магілёўская вобласць	Ліпень	Кастрычнік
Бабруйск гор.	5	3
Бабруйск РВПС	-	4
Бялынічы р.в.	-	-
Быхаў р.в.	-	1
Глуск р.в.	-	-
Горкі гор.	5	36
Дрыбін р.в.	-	1
Кіраўск р.в.	-	-
Клічаў р.в.	-	-
Краснаполле р.в.	-	-
Клімавічы р.в.	14	39
Касцюковічы р.в.	1	16
Круглае р.в.	-	1
Мсціслаў р.в.	1	26
Магілёў гор.	15	17
Магілёў РВПС	1	2
Асіповічы гор.	6	5
Слаўгарад р.в.	-	-
Хоцімск р.в.	-	-
Чэрыкаў р.в.	-	-
Чавусы р.в.	-	-
Шклоў р.в.	-	1
Усяго:	**48**	**152**
Усяго па краіне	**883**	**1470**

У першым квартале падпіска складала на студзень 548 асобнікаў. Нейкі прагрэс назіраецца.

Аналізаваць усе змены я не буду. Кожны можа зрабіць гэта самастойна. Агульная тэндэнцыя зразумелая. Белыя плямы ў дзейнасці ТБМ відны, як відна і праца.

Рэдакцыя дзякуе ўсім, хто паверыў у нашую газету і абяцае зрабіць усё, каб “Наша слова” стала вашым словам, стала словам беларускага нацыі.

Станіслаў Суднік.

Паважаная рэдакцыя !

Дапамажыце, калі ласка, падпісацца на газету **“Голас Беларуса”**, каб атрымліваць яе без перашкод.

Таксама пажадаў бы мець падпіску на газету **“Беларускі калекцыянер”**, але, на жаль, не маю ніякай інфармацыі наконт гэтага выдання.

Дапамажыце, калі ласка !

РЭХА

З павагай да “Нашага слова”, Уладыслаў Жыгалка.

220006, г.Менск, вул. Надзеждзінская. 9-104. Беларусь.

Ад рэдакцыі газеты “Наша слова”.

*Для ўсіх, хто цікавіцца газетай **“Голас беларуса”** кантактны тэлефон 017-2-84-12-50. Адрас: Менск, вул. Варвашэні, 8. Адрас рэдакцыі газеты **“Беларускі калекцыянер”**: 211030, г. Орша,вул. Флёрава, 7-16. Беларусь.*

Добры дзень, Аляксандр Іванавіч!

Паважаная рэдакцыя “Нашага слова”.

У № 37 ад 23 верасня 1998 г. быў змешчаны верш “Усяму свой час” за подпісам Алеся Ляскоўскага в.Марцянаўцы Ваўкавыскага раёна. Мне здаецца, што гэта былы мой настаўнік Аляксандр Іванавіч Ляскоўскі. Ён вучыў мяне ў чацвёртым класе Ганасаўскай пачатковай школы, Бурняўскага с/с, Ваўкавыскага раёна.

--Ці памятаеце мяне, Аляксандр Іванавіч. Вы былі на кватэры ў Пачуйках, а школа была ў нас, у Ганасаўцах. Гэта прайшло ўжо многа часу, ужо я сама пенсіянер. Калі гэта так, дык адгукніцеся. Я — гэта Рыжко Віктар Філіпавіч, а жыву цяпер у Гродзенскім раёне, Капцеўскага с/с, в. Капцеўка, вуліца Перамогі, 69.

Дзякую Вам за верш, за Вашую неабыякавасць да адраджэння беларускай мовы. Вас я стаўлю ў адзін шэраг з вялікім прыхільнікам у справе адраджэння беларускасці на Гарадзеншчыне Алесем Белакозам. Вы не можаце яго не ведаць. Гэта ж Гудзевічы. Амаль што, “мой родны кут”.


Дык пішыце мне.

З прывітаннем,
В. Рыжко

Падпіска скончана. Падпіска працягваецца.

Сакратарыят ТБМ падпісаў сельскія бібліятэкі Баранавіцкага раёна на газету “Наша слова” на апошнія два месяцы 1998 года

Чытайце матэрыялы 1-ай навукова-практычнай канферэнцыі ТБМ у Магілёве, ад 27 траўня 1998 года.



У Магілёўскім гуманітарна-эканамічным недзяржаўным інстытуце выйшла кніга “Сацыякультурная прастора мовы”. Аўтары С. Іванова, Я. Іваноў, Н. Мячкоўская. У кнізе аналізуецца моўная сітуацыя ў Беларусі, этычныя калізіі двухмоўя, ставіцца праблема лінгвакраіназнаўчай рэпрэзентацыі нацыянальна-культурнай семантыкі беларускай мовы. Асобную частку складаюць матэрыялы дакладаў і паведамленняў 1-ай навукова практычнай канферэнцыі “Беларуская мова: стан ужытку пасля рэферэндуму”, прысвечанай актуальным пытанням сучаснага сацыяльна-прававога і культурнага статусу беларускай мовы.

Павышэнне дзейснасці СМІ ў Рэспубліцы Беларусь

5 кастрычніка ў Гародні прайшоў міжнародны семінар "Павышэньне эфектыўнасці дзейнасці СМІ у Рэспубліцы Беларусь". Семінар наладзілі: Каліфарнійскі інстытут свабоднай прэсы і Беларуская асацыяцыя журналістаў. Семінар найбольш быў цікавым таму, што на ім шмат дыскусіяваліся праблемы менавіта незалежнай рэгіянальнай прэсы. Спадар Клэйтан Хасвэл з Сусветнага інстытута свабоднай прэсы (Каліфорнія) падзяліўся досведам стварэння ўстойлівых незалежных СМІ ў Амерыцы. Дарэчы, у Амерыцы амаль што не існуе прэсы, якая ад каго-небудзь залежала бы. У амерыканскай Канстытуцыі запісана: "Няма сілы, няма закону, які б кантраляваў свабоду прэсы, рэлігіі, права крытыкаваць свой урад". І што найбольш важна, гэты закон Канстытуцыі працуе. Існуе кодэкс маралі і этыкі журналіста, але ён мае права выказаць любое сваё меркаваньне. У нашай краіне, на жаль, да гэтага яшчэ далёка. Таму развіццё менавіта незалежнай прэсы (газета "Наша слова" — гэта газета Таварыства Беларускай Мовы, але гэта не дзяржаўная газета) на сённяшні дзень мае выключнае значэнне. Тыя навіны, якія нашы чытачы могуць даведацца толькі з незалежнай прэсы, даволі праблематычна атрымаць у дзяржаўных або афіцыйных органах. Цэнтр прававой аховы пры Беларускай асацыяцыі журналістаў распрацаваў рэкамендацыі, якім чынам павінны дзейнічаць журналісты, якім адмаўляюць у атрыманні нейкай інфармацыі. Патрэбна ведаць артыкул 32 "Закону аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі". Інфармацыю павінна патрабаваць рэдакцыя, а не асобны журналіст. Кіраўнік рэдакцыі павінен аддаць свайму супрацоўніку афіцыйны загад сабраць нейкую інфармацыю. Калі нейкі афіцыйны ворган адмаўляецца гэтую інфармацыю паведаміць, існуе працэдура, як змагацца з гэтым ворганам. Патрэбна падаваць афіцыйную скаргу ў вышэйшы ворган. Калі і гэта не дапаможа — падаваць у суд. Я знарок гэтак падрабязна затрымліваюся менавіта на гэтым пытанні, таму што "Наша слова" таксама сутыкаецца з гэтакімі праблемамі. Не заўсёды мы можам атрымаць патрэбную інфармацыю пра стан беларускай мовы ва ўсіх патрэбных нам ворганах. І не заўсёды тая інфармацыя, якую мы атрымліваем, адвядае рэчаіснасці. Афіцыйныя ворганы могуць лічыць, што стан з беларускай мовай у іхнім рэгіёне найлепшы, між тым гэта можа быць зусім наадварот. Карэспандэнты "Нашага слова" павінны мець магчымасць атрымаць менавіта сапраўдную інфармацыю.

Таццяна Рапкава — вядомая журналістка са Славаччыны — падзялілася сваім досведам, як зацікавіць чытача. Чытачу павінна быць цікавай тая інфармацыя, якую падае газета. Газеты павінны ўмець адшукаць і зацікавіць свайго чытача. Спецыфічныя газеты, такія як "Наша слова" — тым больш. Спадарыня Рапкава падзялілася сваім асабістым досведам, як гэта мажліва зрабіць. Патрэбна высветліць, хто чытач газеты, што гэтыя чытачы хочуць чытаць на старонках газеты, ці хочуць яны наогул чытаць менавіта гэтае выданне. З гэтага нумару рэдакцыя "Нашага слова" прапаноўвае сваім чытачам і прыхільнікам падзяліцца сваім меркаваннем на гэты конт. Давайце газету рабіць разам! Шаноўныя настаўнікі беларускай мовы і літаратуры, старшакласнікі, усе, каму родная мова не абыякавая, выказвайце свае меркаванні на старонках "Нашага слова"!

Лілея Сазанавец.

Яшчэ аб мовах

У нумары 19 "Нашага слова" змешчаны "Закон аб мовах Рэспублікі Беларусь". Дзяржаўнымі мовамі прызнаюцца мовы беларуская і расейская. Не мы адны ў свеце, дзе прызнаюцца дзве мовы дзяржаўнымі. Прыклад Канады: мова ангельская і французская. Бельгія — фламандская і французская. Швейцарыя — чатыры мовы. Розніца, аднак, у тым, што тыя дзяржавы засноўваліся на дзвюх і больш этнічных групоўках і гэтыя мовы развіваліся паралельна. Сёння яны раўнапраўныя і кіраўнікі гэтых дзяржаў і іншыя розныя чыноўнікі павінны адказваць на той мове, на якой да яго звяртаюцца. У іншым выпадку можна страціць працу або быць нават пакараным, за дыскрымінацыю. У Беларусі сітуацыя была іншая. Беларуская мова была дзяржаўная у Вялікім Княстве Літоўскім і толькі пасля расейскай акупацыі ў 1795 годзе беларуская мова была забаронена. Пад час савецкай акупацыі яна не была афіцыйна забароненай, але карыстацца ёю было даволі небяспечна. За гэта маглі абвінаваціць у нацыяналізме — цяжкі грэх, за які плаціліся дзесяццю або больш гадамі канцлагеру. Як жа выглядае моўная сітуацыя ў Рэспубліцы Беларусь сёння? Вярхоўная ўлада карыстаецца выключна расейскай мовай, прэзыдэнт рэспублікі карыстаецца выключна расейскай мовай. Беларускамоўныя школы зачыняюцца. Тэлебачанне, у асноўным, на расейскай мове. Адзіная беларускамоўная радыёстанцыя ўрадам была зачынена (маецца на ўвазе "Беларуская маладзёжная").

Карыстаца беларускай мовай часта небяспечна, бо былі выпадкі, калі амонаўцы збівалі людзей за беларускую гаворку. Амонаўцы — выканаўцы волі ўраду. Людзей збівалі да непрытомнасці. А ў Канстытуцыі запісана: дзяржаўная мова беларуская і расейская. Відаць, гэтая Канстытуцыя, як і сталінская, некалі, ёсць толькі на паперы. Як доўга беларускі народ будзе трываць гэтакую несправядлівасць? Як доўга ён будзе пазбаўлены правоў чалавека? Як доўга ён не будзе мець права на прыватную маёмасць? Як доўга ён будзе жабраком у сваёй краіне? На гэта я не маю адказу, але адказ павінен мець беларускі народ.

Барыс Рагуля, Канада.

Забарона на прафесію на моўнай прыкмеце

Міхась Пятровіч Булавацкі. Настаўнік матэматыкі. Катэгорыя — вышэйшая. Узрост — 50. Стаж педагагічнай працы: у школе 11 гадоў, у ВНУ (кафедра методыкі выкладання матэматыкі) — 19 гадоў. Адзін з заснавальнікаў Асацыяцыі педагогаў-даследчыкаў Беларусі, кіраўнік творчай лабараторыі настаўнікаў матэматыкі "УМОМ" пры Рэспубліканскім інстытуце ўдасканалення настаўнікаў (1986-1993). Аўтар звыш трыццаці навуковых публікацый аб праблемах выкладання матэматыкі ў школе (на чатырох мовах). Кіраўнік эксперыментальнай работы па засваенні настаўнікамі г.Менска наватарскіх тэхналогій (1987-1992), за што ўзнагароджаны Ганаровай граматай упраўлення адукацыі Менгарвыканкама. Удзельнік некалькіх міжнародных навуковых канферэнцый. Актыўны папулярызатар перспектыўных тэхналогій навучання матэматыцы праз масавую прэсу і непасрэдныя выступленні перад настаўнікамі, з якімі аб'ехаў дзесяткі гарадоў былога Савецкага Саюза. Аўтар першага ў Беларусі падручніка для пятых класаў беларускіх гімназій (падручнік выдадзены пробным выпускам у Выдавецтве Магілёўскага ўніверсітэта)... Спадар Міхась кіраўнік Магілеўскай абласной рады ТБМ.

Поспехі яго работы ў школе засведчаны перамогамі яго вучняў на алімпіядах і ў конкурсах у розных ВНУ. Аб яго працы ў педагагічным інстытуце студэнты так гаварылі карэспандэнту І.Аўчыннікавай: "Для нас он был идеалом преподавателя. Ни у кого столько не взяли. Он влюбил нас в профессию, смысла которой мы до встречи с ним не понимали. Нам по-настоящему посчастливилось, что мы занимались у Буловацкого." ("Известия" 6.04.1985).

Сёння, на пачатак кастрычніка 1998 года, гэты чалавек ужо тры месяцы беспрацоўны. Кафедра Магілёўскага ўніверсітэта, на якой ён працаваў 19 год, адмовілася ад яго паслуг, бо ён — не кандыдат навук. Чаму ж тады ён не ў школе? Адказ неймаверны: чалавек шукае школу, дзе б ён мог выкладаць матэматыку на беларускай мове. Шукае і не знаходзіць. Просіць: дайце мне хаця б адзін клас! Няма такога класа. Просіць: дайце мне магчымасць набраць такі клас, — да мяне пойдуць вучні. Адказваюць: спачатку вы ўладкуйцеся ў расейскамоўную школу, а потым з дырэктарам гэтай школы і вырашайце пытанне. Аказваецца, шлях да беларускай мовы ляжыць праз расейскую.

Ці ж патрэбныя Беларусі настаўнікі матэматыкі (мабыць, не толькі матэматыкі), якія валоджаюць беларускай мовай, любяць яе і хочуць вучыць дзяцей на гэтай мове?

Магчыма яму здолеюць дапамагчы прэзідэнт Беларусі і міністр адукацыі, якія на ўсіх сустрэчах запэўніваюць пра роўнасць дзвюх славянскіх моваў і гэта ў той час, калі мясцовя чыноўнікі метадычна знішчаюць усе праявы беларускасці на Беларусі.

Алег Трусаў,
першы намеснік старшыні ТБМ імя Ф.Скарыны.

Падарожжа, наладжанае ТБМ

27 верасня Лідскімі Радамі ТБМ і ТБШ для школьнікаў сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту было наладжана вельмі цікавае падарожжа. Спачатку наведалі Бярозаўскі шклозавод "Нёман", якому ў гэтым годзе спаўняецца 115 год. Гэта адно з самых старэйшых прадпрыемстваў гэтай галіны ў нашай краіне. Дзеці наведалі музей на прадпрыемстве, увачавідкі пазнаёміліся з працэсам стварэння шкляных вырабаў.

Дзесьці каля 11-ці гадзін раніцы падарожнікі ўжо былі ў Навагрудку — старажытнай сталіцы Вялікага Княства Літоўскага. Гэты горад, які калісьці быў "тварам" нашай дзяржавы, яго-най візітнай карткай, зараз, на жаль, знаходзіцца ў заняпадзе. У свой час акупацыйныя ўлады як Польшчы, так і Расеі праводзілі палітыку на недазваленне развіцця невялікіх беларускіх гарадоў і мястэчак. У Навагрудку па сённяшні дзень няма чыгункі, што, зразумела, не дазволіла гораду расці і развівацца. Між тым, Навагрудак — радзіма вялікага беларускага паэта Адама Міцкевіча. Школьнікі Лідчыны наведалі музей паэта, падняліся на гару Міндоўга і курган, які быў насыпаны ў гонар Адама Міцкевіча. Дарэчы, сёлета ў Навагрудку святкаваліся не толькі 200-ыя ўгодкі Адама Міцкевіча, але і 100-годдзе ягонага "Пана Тадэвуша" (выдання на беларускай мове).

Наступны прыпынак у падарожжы — Мірскі замак — помнік архітэктуры XVI - XX ст.ст. Гэта быў, напэўна, цвік праграмы, бо што можа быць цікавей для падлетка, як падняцца на вежу па стромкіх прыступках?

Пасля Міра быў Нясвіж, вядомы замак Радзівілаў, у якім зараз размешчаны санаторый "Нясвіж", і Фарны касцёл. Нясвіж адметны не толькі замкам і касцёлам, але і вельмі прыгожым старым паркам, які з'яўляецца помнікам гісторыі і прыроды.

Змораныя, але вельмі задаволеныя, падарожнікі вярнуліся ў Ліду. Па дарозе дахаты слухалі кампазіцыі беларускіх гуртоў. Была праведзена віктарына "Угадай беларускі гурт", пераможца атрымаў касэту гурта "Крама".

Лілея Сазанавец
г.Ліда.



Павел Сцяцко,
доктар філалагічных навук, прафесар, старшыня Гардзенскай абласной рады ТБМ імя Францішка Скарыны

"З чужой моўнай практыкі..."

(Працяг. Пачатак у №№ 5-7, 12-15)

Крумкач, крук, груган — а не воран.

Расейскае ***ворон*** В. Ластоўскі перакладае наступным чынам: ***"Ворон м., птах з пароды варон, чорны ўвесь з адлівам: крук. Лесавы крук: крумкач"*** (ПРК(б) С.С.83). У "Беларуска-расійскім слоўніку" М. Байкова і С.Некрашэвіча таксама бачым: ***"Крук, крумкач м. — ворон"***. А таксама ***"Груган м. — ворон"***.

Усе наступныя перакладныя слоўнікі да рас. ***ворон*** падаюць толькі ***груган і крумкач.*** А вось самы асіміляцыйны даведнік двухтомавы "Беларуска-рускі слоўнік" фіксуе і наступнае: ***"Воран м. см. крумкач"*** (БРС-88.С.239). Паводле каментару Слоўніка (С.10."Значэнне спасылак"), гэта азначае, што "Спасылачнае слова ўжываецца ў мове радзей або мае зніжаную стылістычную афарбоўку". Але для чаго спатрэбілася падача гэтага ***"воран"*** у слоўніку? Дзеля зліцця моваў? Слова ***воран*** не падае ніводны іншы слоўнік беларускай літаратурнай мовы. Нават шасцікнігавы "Тлумачальны слоўнік беларускай мовы", у якім нямала парушэнняў лексічнай нормы.

У выдатнага знаўцы мовы, Рыгора Барадуліна чытаем: *"Жаўранак абнашчыцца расінкай, Падаллю насыціцца крумкач ... Неба корміць жаўранка з далоні. Крумкача гадуе дол глухі"* (Да цябе душой і думкамі хінуся. — ЛіМ 2 студзеня 1998 г.).

Мысляр і мысліцель

Слова ***мысліцель*** апошнім часам набывае сваіх аднакаранёвых апанентаў без суфікса ***-цель*** (гэты словаўтваральны фармант беларускай мове неўласцівы, пра што няраз згадвалася). Так, у перыядычным друку сустракаем: ***мыслівец, мысліўца, мысляр***. У Рыгора Барадуліна, надта адмысловага словатворцы, выкарыстоўваюцца два іншасуфіксавыя аднакаранёвыя варыянты: *"І знайшоў пункт апоры мысліўца* (Полымя. 1995. №7. С.4); *і, задумаўшыся, не варухнуцца камяні — незразуметыя мысляры"* (ЛіМ. 2.01.1998).

У газеце "Пагоня" (19. 09.1997): *"245 гадоў з дня нараджэння Ераніма Страйноўскага, мысьляра і правазнаўца другой паловы 18 стагоддзя"*. У Антаніны Хатэнкі, надта чуйнай да слова пісьменніцы, часта выкарыстоўваецца слова ***мысляр***. Напрыклад: "*Але творцы-мысляры ўсёдаравальныя — са свае духоўнае вышыні яны сыходзяць да нас"* (Наша слова.1998.№1). Яно створана паводле дзейнай у беларускай мове словатворчай мадэлі: "аснова дзеяслова (або назоўніка) + суфікс -ар (-яр), як і ***пісар, друкар, змагар***.

Можна меркаваць, што новатвор ***мысляр*** стане трывалым канкурэнтам, а затым і адмысловым беларускім адпаведнікам рас. ***мыслитель***. Як і ***мыслёвы*** замест ***мысліцельны*** (рас. ***мыслительный***). Параўн. У.Н.Гілевіча:" *і дзесяткі іншых навукоўцаў, мысляроў, асветнікаў...*"(ЛіМ. 23. 01. 1998. С.15).

Кахля ці кафля.

Слоўнікі 20-х гадоў падавалі толькі кахля. У В. Ластоўскага: *"Кафля жлечная пліта ўзорамі ці гладкая, найчасцей паліваная: кахля"* (ПРК(б)С.С.253). У "Беларуска-расейскім слоўніку" М.Байкова і С.Некрашэвіча: *"Кахля ж. — изразец"*. Форму ***кахля*** бачым у слоўніках Насовіча, Бялькевіча, Каспяровіча, Шатэрніка, у дыялектных слоўніках гарадзенскіх гаворак — Таццяны Сцяшковіч, Апанаса Цыхуна і аўтара гэтых радкоў. Форма ***кахля*** адпавядае першакрыніцы — нямецк. ***Kachel.*** Аднак сучаснай нормай лічыцца чамусьці ***кафля*** — форма, больш блізкая да тае, што замацавалася ў расейскай мове, — ***кафель.*** І вытворныя прыметнікі падагнаныя пад расейскую структуру. Так, у РБС-82 бачым: ***"Кафель м. кафля ж.; кафельный — кафляны, кафельны"*** (Т.І.С.350). А ў народнай мове Гарадзеншчыны: ***кахля і кахлёвая печка.*** Форма ***кахля*** выкарыстоўвалася і класікамі нашай літаратуры. У Якуба Коласа чытаем: *"Ды яшчэ бульбу ў кахлянай печы свінні варылі"* (У двары пана Тарбецкага). Дык чаму штучную форму, якая не адпавядае першакрыніцы, замацавалі, як літаратурную норму. Тады мо і натуральнае ***хутар*** заменім на "звышправільнае ***футар***"?!

(Працяг у наступным нумары)

“Разбітая ваза”, “Зорка Венера”, або яшчэ слова пра Сюлі - Прудома ...

Я блукаў па вуліцах небеларускага па мове горада Баранавічы і спецыяльна распытваў людзей, ці ведаюць яны, хто такі Сюлі - Прудом? Дык ніводзін чалавек не даў сцвярджальнага адказу.

Што і гаварыць, гэтаму ўсяму мы абавязаны толькі нашай школе і ўсёй сістэме адукацыі, якая ніколі не рабіла з нас зацікаўленых асобаў, гэта бюракратычная дракула напаўняла нашыя галовы нейкімі ведамі і смеццем, забывая між іншым запаведзь старажытнагрэчаскіх філосафаў, што галава чалавека не пасудзіна, якую патрэбна запоўніць, а паходня, якую трэба запаліць...

Дык вось узяць да слова таго ж Сюлі-Прудома. Як аказваецца, гэта псеўданім французскага паэта Рэне-Франсуа-Армана Прудома (1839 - 1907), да таго ж лаўрэата славутай і прэстыжнай Нобелеўскай прэміі у вобласці прыгожага пісьменства. Кажуць, што гэты рамантык — творца ў паэзіі апярэдзіў нават сімвалістаў. Так гэта ці не, вядома толькі знаўцам, я ж пра гэта нічога не магу сказаць, бо па-беларуску яго не чытаў, як і мільёны маіх суплеменнікаў. Больш таго, як і ў мае дзіцячыя гады, так і сёння, у школах няма такой тэмы, як “Лаўрэаты Нобелеўскіх прэмій у літаратуры і іх уздзеянне на развіццё і росквіт беларускага прыгожага пісьменства”. Аб чым я пішу, калі хутка зачыніцца апошні беларускамоўны клас на Беларусі. Вылюдкі фашысты гэтага не рабілі, толькі пілсудчыкі і сталіністы і іх выкармышы гэта робяць з любоўю, з натхненнем, па-садысцку!..

Але вернемся да Сюлі-Прудома, як мне не змяняе памяць, усё ж нешта кволае з яго з'явілася ў нашым друку:

Калі заблішчыць гэтая зорка,
Самая цудоўная, самая далёкая,
Скажыце ёй, што ёй
належыць маё каханне,
О. апошнія з чалавечага роду.

(Максім Багдановіч, вершы, выдавецтва “Народная асвета”, Менск, 1967, стар.43).

Але прычым “Разбітая ваза”? Як тутака не сказаць, што пад такой назвай існуе цудоўны верш славутага расейскага паэта Аляксея Апухціна (1840-1893). Ён недзе ў 1870-я гады зрабіў паэтычны запіс у альбом Казловай без назвы. Гэты верш у музыцы спачатку Арэнскага, а потым Опеля зрабіўся вядомейшым расейскім рамансам. Вось яго пачатак:

Ту вазу, где цветок
ты сберегала нежный,
Ударом веера
толкнула ты небрежно,
И трещина, едва
заметная, на ней
Осталась... Но с тех пор
прошло не много дней,
Небрежность детская
твоя давно забыта,
А вазе уж грозит
нежданная беда!
Увял её цветок;
ушла её вода ...
Не тронь её: она разбита.

Даследчыкі праявілі шчырую зацікаўленасць да гэтага шэдэўра, да гісторыі яго стварэння. І хутка выявілася, што гэта было “Подражание Сюлли-Прюдому”, я перабраў беларускія аналагі перакладу гэтага слова і не змог выбраць з іх — перайманне, імітыванне, наследванне — сугучнага маёй душы!

Відавочна, Сюлі-Прудом натхніў не толькі Апухціна, але і нашага Максіма Адольфавіча Багдановіча, так-

РАМАНС

так, я не зрабіў памылкі ў імя па-бацьку нашага песняра, бо менавіта Адольфам звалі яго родзіча...

Мы сразу ж адзначым, забягаючы крышачку ўперад, што калі “ перайманнем” Апухціна занялiся прафесійныя музыканты, дык у Максіма - Кніжніка яго верш “Раманс” зрабіў сваёй любімай песняй сам беларускі народ, які даў яму сваю новую назву “Зорка Венера”.

Звернемся да тых радкоў Сюлі-Прудома, якія Максіма Багдановіча натхнілі на стварэнне сусветнага вершаванага шэдэўра:

Калі аднойчы засвеціцца
гэтая зорка,
Найпрыгажэйшая
і найдалейшая,
Скажыце ёй, што я кахаў яе,
О, апошнія з роду людскога.

(Максім Багдановіч, Поўны Збор твораў, том І, Мінск, “Навука і тэхніка, 1992,стар.77).

Гэтыя словы выдатнага французскага паэта, змешчаныя ў якасці эпіграфа перад творам самога Багдановіча, нейкім чынам уплываюць на ўвесь яго верш. Параўнаем зараз першыя чатыры радкі “Раманса” з тым, што натхніла нашага творцу, г.зн. з словамі Сюлі-Прудома:

Зорка Венера ўзышла над зямлёю,
Светлыя згадкі з сабой
прывяла ...
Помніш, калі я спаткаўся
з табою,
Зорка Венера ўзышла.

Прывядзём услед за імі і яшчэ адзін слупок:

З гэтай пары я пачаў угледацца
У неба пачное і зорку шукаў.
Ціхім каханнем к
табе разгарацца
З гэтай пары я пачаў.

Пасля гэтага давайце возьмем зборнікі вершаў Апухціна і Багдановіча і паасобку прачытаем іх творы “ Разбітая ваза” і “Раманс”. Як бачна, у іх адзін і той жа матыў любоўных пачуццяў і перажыванняў, шчыры, гарачы і адкрыты свет закаханых людзей.

Я не магу сказаць, які з вершаў больш да спадобы мне, як і прафесійныя рамансы на верш “Разбітая ваза”, або папулярная беларуская народная песня “Зорка Венера” на словы “Раманса”?! . Але адно можна сцвярджаць, што французскія паэтычныя шэдэўры спараджаюць адзін за адным творы такога ж сусветнага масштабу, і тады ў адным паэтычным строю мы бачым і лаўрэата Нобелеўскай прэміі Сюлі-Прудома, і “новага Пушкіна” Аляксея Апухціна, і класіка беларускай літаратуры Максіма Багдановіча ...

Міхась Маліноўскі,
правадзейны сябар
Геаграфічнага таварыства,
Баранавічы.

Беларусь — сэнс і сімвал жыцця

Да 110 - годдзя з дня нараджэння Язэпа Драздовіча

Язэп Драздовіч нарадзіўся 1 (13 па новаму стылю) кастрычніка 1888 года ў засценку Пунькі што на Дзісеншчыне (зараз Глыбоцкі раён). Нарадзіўся на вялікае хрысціянскае свята Пакрова Прасвятое Багародзіцы. Звычайна большасць людзей, што нарадзіліся пад сузор'ем Шаляў, надзелены надзвычай абвостраным эстэтычным светаўспрыманнем.

Усё жыццё мастака, за выключэннем хіба што сямі гадоў службы ў расейскім войску, прайшло на абшарах роднай Бацькаўшчыны. Гэта, як родная Дзісеншчына, так і Вільня, Беласток, Наваградак, Менск ды само Палессе.

Прафесійную мастацкую адукацыю набыў у Віленскай рысавальнай школе прафесара жывапісу Г.Трутнева.

Язэп Драздовіч працаваў у многіх відах выяўленчага мастацтва: жывапісе кніжнай і станковай графіцы, скульптуры.

Ужо да першай сусветнай вайны з'явіліся яго працы ў галіне кніжнай графікі; сярод іншых вылучаецца афармленне ў стылі мадэрн першага выдання вершаў Канстанцыі Буйло “Курганная кветка”.

Пад час грамадзянскай вайны ў Расеі Язэп Нарцызавіч працуе мастаком у беларускім літаратурным выдавецкім аддзеле камісарыята асветы, прымае актыўны ўдзел у афармленні першага ў Савецкай Беларусі лемантара.

Напярэдадні 1921 года ён вяртаецца да хворай маці на родную Дзісеншчыну. У гэты час падпісваецца Рыжская дамова між Расеяю і Польшчай, і ўжо ў каторы раз Беларусь падзелена, і мастак застаецца ў Заходняй Беларусі. Нягледзячы на гэта ён працягвае падтрымліваць сувязі з інстытутам беларускай культуры, дасылае ў Менск замалёўкі помнікаў нацыянальнага дойлідства, этнаграфічных рэчаў. Навуковыя і мастацкія працы Язэпа Драздовіча неаднаразова адзначаліся прэміямі Акадэміі навук БССР.

Пад час вандровак па Заходняй Беларусі мастак стварае ўнікальныя графічныя альбомы: сотні малюнкаў, прысвечаных помнікам старажытнага дойлідства Крэва, Вільні, Глыбокага, Ліды, Наваградка і іншых мясцінаў нашага краю. Сярод іх замалёўкі гарадзішчаў, курганоў, замкаў, храмаў, гумнаў, хатаў. Усё гэта ўнікальны матэрыял для даследчыкаў і гісторыкаў.

Акрамя гістарычных рэалій мастака захапляюць касмічныя фантазіі і, як ні дзіўна галоўнае ў фантастычнай тэме незямное шчасце. Шчасце ды дабрабыт, чаго не давялося звядаць Язэпу Драздовічу на працягу свайго зямнога жыцця, бо не вельмі радасным было яго дзяцінства. Ён быў шостым дзіцём у маці-удавы, што засталася адна, без зямлі, з шасцю дзецьмі на руках. І далейшы яго жыццёвы шлях быў цяжкі. Нястача была такая, што іншы раз не хапала грошай на фарбы і палатно. З той нагоды значная частка творчасці Язэпа Драздовіча безнадзейна згублена.

Ён закончыў свой зямны шлях там дзе і нарадзіўся: пахаваны на Лінненскіх могілках, непадалёку ад былога засценка.

Было гэта так. На дарозе ў маразы, знайшлі сяляне беспрытомнага “дзядзьку Язэпа” і адвезлі ў лякарню, дзе ён і памёр, было гэта не пры панскай Польшчы, а значна пазней. Беларуская Савецкая Энцыклапедыя засведчыла гэтую сумную дату пад знакам пытання — “1954?”

Язэп Драздовіч — непамерны талент зямлі беларускай. Пакутны жыццёвы шлях яго — шлях кожнага шчырага беларуса.

Язэп Палубятка.

“З кірункам на будучыню”

25-26 ліпеня ў Вільні прайшоў другі з'езд беларусаў Балтыі. Першы — адбыўся ў ліпені 1994 года, па ініцыятыве беларускай амбасады, тады было другое палітычнае становішча ў Беларусі, адпаведна і ў беларускай дыяспары замежжа. Тады ж у 94 годзе з'езд праводзіла Таварыства Беларускай Культуры ў Вільні (ТБК), было прынята праводзіць такія мерапрыемствы праз чатыры гады. І ў 1998 годзе ТБК ўзяло на сябе правесці адказнае мерапрыемства. Вядома, у метраполіі пагоршылася становішча ў адносінах да беларускай мовы, культуры, гісторыі ды і ўсяго беларускага. Амаль няма беларускіх школ, добра ведаем гісторыю з беларускім ліцэем у Менску, з Домам літаратараў, з забаронай вывучаць творы Л. Геніюш, Н.Арсеннеевай і г.д.

Прыклады можна прыводзіць бясконца. Больш складана стала і беларусам у замежжы. Вядома, калі самі не шануем спадчыну, а мова — самае вялікае багацце, то так адносяцца і да нас. Таму і з'езд у гэтым годзе было правесці і матэрыяльна і маральна складана. Ніякой дапамогі з боку Беларусі. Улічваючы досвед і памылкі другога з'езду беларусаў свету “Бацькаўшчына”, на якім з дапамогай уладаў адбыўся раскол, на другі з'езд беларусаў Балтыі, у першую чаргу з-за матэрыяльных цяжкасцяў, вырашылі абмежавацца колькасцю дэпутатаў, сабраліся аднадумцы, эліта з замежжа, для якой неабыякавы лёс мовы, культуры, гісторыі, Бацькаўшчыны. Прыехала 15 дэлегатаў з Менску, сярод якіх Л.Баршчэўскі, Р.Гарэцкі, А. Грыцкевіч, А.Белы, Г.Сурмач, С.Шарэцкі і іншыя, з Польшчы 15 чалавек, з Латвіі прафесар С.Кузняцоў, з Эстоніі 10 чалавек, з Сант-Пецярбурга, з ЗША і беларусы Летувы.

На з'ездзе прысутнічаў і З.Пазьняк. З старонак гісторыі мы ведаем, як працвітала беларуская мова ў Вялікім Княстве Літоўскім, на ёй напісаны Статут 1588 г. Тут надрукаваны першыя беларускія кнігі, жылі і тварылі Фр.Скарына, К.Каліноўскі, Фр.Багушэвіч, браты Луцкевічы,, Цётка, М.Гарэцкі, Б.Кіт і другія славутыя беларусы.

Бурна развівалася беларуская культура, асветніцкае і палітычнае жыццё ў Вільні на пачатку XX стагодздзя, з 1919 па 1944 г. працавала беларуская гімназія, якая “кавала” кадры нацыянальнай беларускай інтэлігенцыі на працягу чвэрці стагоддзя, пакуль не зачынілі бальшавікі, прыйшоўшы да ўлады з 1944 году аб ёй было забаронена нават упамінаць, а беларускую інтэлігенцыю мэтанакіравана знішчылі. А ў пасляваенны час прыехалі ў Летуву ў асноўным “русскоязычные” беларусы, якія адмоўна ставіліся як да незалежнасці Летувы, так і Беларусі і на беларускую культуру ніякага ўплыву не маюць. І як толькі распалася савецкая імперыя, Летува першая стала незалежнай краінай, пачало нарысе адраджацца беларускае жыццё, менавіта дзякуючы рэшткам той “ недабітай” інтэлігенцыі, выпускнікам былой беларускай гімназіі. У 60-е гады, тыя хто застаўся жывым, вярнуліся з месц “не столь отдалённых” ў Вільню, яны і ў тыя часы пачалі тайна збірацца ў хатцы Зоські Верас, Зоі Кайшанкі, абменьваліся думкамі, спявалі беларускія песні, выпісвалі друк.

Калі з'явілася магчымасць збірацца адкрыта ў канцы 80-х гадоў, тады і было ў 1988 годзе зарэгістравана ТБК, у якое ўвайшла і стварыла свядомая беларуская інтэлігенцыя: Л.Луцкевіч, Х.Нюнька, Л.Кароль, А.Анішчык, М.Рулінскі, К.Шышэя, С.Карабач, Я.Станкевіч. Гэтыя людзі — старонка беларускай гісторыі. Потым да ТБК пачала далучацца творчая беларуская інтэлігенцыя і мастакі, журналісты, паэты, настаўнікі.

Дзякуючы намаганням гэтых людзей, у пачатку 90-х гадоў адкрылася ў Вільні беларуская школа, кафедра беларусістыкі пры педінстытуце, беларускае слова на радыёхвалях Летувы, беларуская праграма на тэлебачанні, пачала выдавацца “Наша Ніва”, з 1997 года ТБК выдае газету “Рунь”, выпушчаны дзве кнігі Мар'яна Пецюкевіча “У пошуках зачараваных скарбаў” і Лявона Луцкевіча “Вандроўкі па Вільні”, рыхтуецца пра ІІ з'езд беларусаў Балтыі. Адкрыты шыльды на дзвюх мовах беларускай і летувіскай беларускім дзеячам, якія жылі і працавалі ў Вільні: Р.Шырме, В.Ластоўскаму,Я.Купалу, Бр. Тарашкевічу, К.Каліноўскаму, П.Сергіевічу,Фр.Скарыне, пастаўлены помнікі братам Луцкевічам, П.Карузе, Фр. Аляхновічу і т.далей. Такое доўгае ўступнае слова пра дзейнасць ТБК, каб зразумелі, колькі зроблена ў захаванні беларускай спадчыны, а імпрэзы наладжаныя ТБК, прысвечаныя Ул.Жылку, ксяндзам Адаму Станкевічу, І.Галкоўскаму, М.Гарэцкаму, сустрэчы з Н.Гілевічам, Л.Баршчэўскім, В.Коўтун, В.Быкавым,Д.Бічэль-Загнетавай і т.д.. Усё зроблена намаганнямі, аўтарытэтам кіраўніка ТБК Хведара Нюнькі. Гэта культурная, асветная арганізацыя, мэта якой адрадзіць і захаваць беларускую спадчыну ў Вільні.

Вядома для кіраўніцтва ТБК неабыякавы лёс беларускай мовы, Бацькаўшчыны, абурае знішчэнне беларускага школьніцтва, знікне мова, знікне народ. Таму ТБК не мае падтрымкі з боку беларускай амбасады ў Летуве, з боку метраполіі. На другім з'ездзе беларусаў краін Балтыі сабраліся аднадумцы.

Зараз у Летуве 13 беларускіх суполак, 11 ўваходзяць у Згуртаванне беларусаў Летувы. Яны атрымліваюць дапамогу з боку ўладаў Беларусі, у іх сучасная кам'ютарная тэхніка, падтрымка з боку амбасады, дазволена рабіць візы.

Пра такіх дакладна сказаў Я.Купала ў п'есе “Тутэйшыя”, у вобразе, М.Зносака. Сапраўднай інтэлігенцыі, якая не здрадзіла сваім ідэалам былі адзінкі і на пачатку стагоддзя і зараз. Кіраўнікі адзінаццаці суполак былі запрошаны ў якасці гасцей, вядома, каб не сапсаваць адносін з Менскам не прыйшлі на з'езд (такую інфармацыю падало літоўскае тэлебачанне). Прысутнасць З. Пазьняка расейскамоўная прэса “чуць чырвоная” падала, як палітычны з'езд, дакладна яго словы цытавалі, што зараз усё палітыка — і мова, і кулінарыя. Гэта так і ў Летуве таксама катастрафічнае збядненне народу, толькі і гавораць аб росце цэн і паслуг. І гэта палітыка. Толькі ў Летуве аб гэтым можна гаварыць і гэта не плітыка.

Вельмі добра сказаў мне летувіс: “Мяне цікавіць толькі летувіскія школы ў Беларусі (Пеляса, Рымдзюны), каб не атрымалася сіміляцыя і больш нічога”. Адмоўныя адносіны да беларускасці ў Беларусі, адмоўна сказваюцца і ў адносінах да беларусаў замежжа як з боку Беларусі так і з боку ўладаў краін пражывання. Таму і мэта з'езду бліжэй пазнаёміцца, абмяняцца думкамі, досведам працы, аб'яднацца, каб рабіць агульную справу — захаваць беларускасць, падтрымаць дэмакратычныя сілы на Бацькаўшчыне, зрабіць газету “Рунь” інфармацыйным цэнтрам беларусаў Балтыі. Два дні напружанай працы, праслухалі грунтоўныя, цікавыя даклады, абмяркавалі кірункі працы, планы. У перапынку з'езду — канцэрт з удзелам дэлегатаў, вандроўкі па беларускай Вільні, наведванне могілак Росы, месца пакарання і зняволення К. Каліноўскага. Вельмі актуальна прагучалі словы К.Каліноўскага і з “Лістоў з-пад шыбеніцы”: ***“Прымі, народзе, па шчырасці маё слова прадсмертнае ... Як дзень з ночкай не ходзяць разам, так і навука праўдзівая не ідзе разам з няволей маскоўскай, а пакуль яна будзе ў нас, нічога ня будзе.***

Не будзе праўды, не будзе багацця і ніякай навукі, адно намі, як скацінай, варочаць будуць не для дабра, а на пагібель нашу...

Бо я табе з-пад шыбеніцы кажу, народзе, што толькі тады зажывеш шчасліва, калі над табой ужо маскаля не будзе!” (1864 год).

Дэлегаты атрымалі ў падарунак кнігу Лявона Луцкевіча “Вандроўкі па Вільні”. З'езд яшчэ больш зблізіў, паяднаў, парадніў, натхніў для дальнейшай плённай працы аднадумцаў. Поўныя ўражанняў ад пачутага і ўбачанага, ідэй развіталіся да новых сустрэч.

Леакадзія Мілаш.
г.Вільня.
28 ліпеня 1998г.

В.І. Саітава

Часопіс “Ateneum wilenskie” — крыніца бібліяграфічнай інфармацыі аб Беларусі

(Працяг. Пачатак у № 39.)

Царкоўна-гістарычная тэматыка займала таксама вельмі значнае месца ў даследваннях. Яе ролю вельмі трапна выразіў у адным з артыкулаў на старонках часопіса гісторык Ф.Конечны: “Справы Русі в ХУІІ яшчэ веку заўсёды былі справамі царкоўнымі (часта выключна); у ХУ веку, сказаць можна, што не было іншай квесціі рускай, як толькі квесція праваслаўя”. Таму пытанні веравызванняў, дзейнасці каталіцкай, праваслаўнай, вуніяцкай царквы прасякалі матэрыялы даследванняў, ці з’яўляліся прадметамі асобнага вывучэння.

Здзяйсненне навуковых задач шчыльна звязвалася са станам бібліяграфічнага забяспечання даследаванняў. Невыпадкова, ва ўступным слове рэдакцыя паведамляла, што ў часопісе будзе весціся бягучая бібліяграфічная інфармацыя аб новых асобных выданнях і артыкулах з часопісаў пра ВКЛ, а ў далейшым і артыкулах з асноўных газет Рэчы Паспалітай. У кожным з раздзелаў ”Atenium Wilenskiego” бібліяграфічная інфармацыя займае значнае месца як па свайму аб’ёму, так і па прызначэнню.

Навуковыя матэрыялы і гістарычная крыніца ў “Ateneum wilenskiem” вызначаюцца выдатным бібліяграфічным аснашчэннем.

Бібліяграфічнае забяспечанне кожнага навуковага даследвання адлюстроўвае метадалагічную і крыніцазнаўчую базу, на аснове якой аўтарам была распрацавана тэма. Шмат бібліяграфічных дадзеных уключана непасрэдна ў тэксты навуковых работ. Аднак асноўнай формай выкарыстання бібліяграфічнай інфармацыі былі падрадковыя бібліяграфічныя спасылкі. Бібліяграфічныя спасылкі, перш за ўсё, прыцягваюць увагу сваёю шматлікасцю. Так, да даследавання кс.З.Обертыньскага “Літоўскія планы польскіх капуцынаў” пададзена 179 падрадковых бібліяграфічных спасылак, да работы В.Шульца “Споры Акадэміі віленскай з піярамі аб выключным праве на школы. 1723 - 1753”. — 202 спасылкі, шмат спасылак да тэкстаў “Трох. дакументаў з ХУ веку, якія датычаць зямлі полацкай” і інш.

Нярэдка самі спасылкі афармляліся не на асобны друкаваны ці неапублікаваны дакумент, а прадстаўлялі сабою спісы літаратуры. Напрыклад, да артыкула С.Кракоўскага “Ваўкавыскі павет у канцы ХУІІІ” зноскі №№ 6 і 9 называліся “Важнейшая літаратура”. Частка спасылак падае фактаграфічную інфармацыю: называюцца падзеі, удзельнікі, даты і г.д. У некаторых спасылках сумяшчаюцца бібліяграфічныя і фактаграфічныя дадзеныя, што ўскладияе іх і павышае інфарматыўнасць. Так, у зносцы № 5 да артыкула Г.Лоўмянскага “Віленскія паперы ХУІ веку” прыведзены цытаты з розных крыніц і вывады самога аўтара, даецца інфармацыя аб дастаўцы паперы з кнігі каморы брэсцкай, аб дастаўцы паперы ў Кобрын, Менск, Магілёў, Пінск, Слуцк, з указаннем, хто прывёз, колькі; якім коштам і якой якасці. Гэтыя фактычныя даныя падцвярджаюцца шэрагам бібліяграфічных апісанняў. Кола крыніц, на якія рабіліся спасылкі, вельмі шырокае. Гэта шматлікія манаграфіі польскіх, нямецкіх, расейскіх і другіх даследчыкаў; навуковыя артыкулы з перыёдыкі і зборнікаў; дыпламатычныя кодэксы: польскі, малапольскі, велькапольскі, мазавецкі, кракаўскі, кракаўскага епіскапства, прускі дыпламатычны кодэкс Фойгта, дыпламатычны польскі кодэкс Догеля, “Codex epitolaris Vitoldi” і др.; дакументы з дзесяткаў архіваў, у т.л. прыватных Сангушкаў, Тызенгаўзаў; друкаваныя выданні многіх польскіх, расейскіх, нямецкіх і другіх архіваў, а таксама шэрагу другіх крыніц. Цытаваныя дакументы характарызуюцца шматмоўем, часцей за ўсё яны створаны на польскай, лацінскай, нямецкай, расейскай, чэскай, французскай мовах. Некаторыя з іх адносяцца да ліку надзвычай цяжка даступных, напрыклад, матэрыялы з уласных архіваў не шырока вядомых асоб. Колькасць цытаванай літаратуры і гістарычных крыніц настолькі вялікая, што склад гэтых дакументаў цяжка ахарактарызаваць. Вялікія аб’ёмы цытаванай літаратуры і неапублікаваных дакументаў да многіх публікацый дазваляюць прыраўняць іх да тэматычных бібліяграфічных спісаў з лагічнай ці часам тэматычнай групоўкай бібліяграфічных запісаў.

Бібліяграфічнае апісанне дакументаў у спасылках выконвалася аўтарамі артыкулаў больш ці менш падрабязна. Прынята было выкарыстоўваць форму ibidem пры паўторным цытаванні, скарачаць словы ў назвах, (“Pis. kn.Pis.ks.”, “Archiwum miejskie ks.” і інш.), дакладна вызначаць тамы і старонкі. Даволі часта апускалі месца і гады выпуску пры апісанні частак шматтомных выданняў. Гэтыя прыёмы дазвалялі ў той час эканоміць паперу, аднак сёння ускладняюць бібліяграфічны пошук. Былі прыклады скурпулёзнага падыходу да бібліяграфічнага афармлення спасылак. Так, Г.Пашкевіч да свайго артыкула ў першай спасылцы падаў “Пералік скарачэнняў найчасцей ўжытых крыніц”.

Цытаванне ў публікацыях “Ateneumu wilenskiego” раскрывае сапраўды вялікую плынь дакументнай інфармацыі, на аснове якой здзяйсняліся даследванні па тэматыцы ВКЛ у міжваенны перыяд у РП.

Шэраг матэрыялаў у часопісе прыартыкульныя спісы літаратуры, а асобныя даследванні аб дзеячах былі вызначаны іх аўтарамі як бібліяграфічныя жанры. Напрыклад, да артыкула В.Ставіньскага пра прафесара Ж.Э.Жыліберта, частка выдатнай навуковай і практычнай дзейнасці якога была звязана з г.Гародняй, пададзены два бібліяграфічных дадаткі, у першым з якіх атрымалі апісанне рукапісы і выявы навукоўца, у другім — крыніцы і літаратура. Сярод крыніц даследавання архівы, музеі бібліятэкі Францыі, Польшчы, Вены, Гародні, прыватныя дакументы ад яго сям’і.

Для іх адлюстравання планавалася весці сістэматычна самас[…]йны бібліяграфічны раздзел. Такі раздзел з’яўляўся часта, але не ў кожным выпуску AW. Бібліяграфічныя матэрыялы, змешчаныя ў ім, захавалі цікавасць для сучасных бібліёграфаў і даследчыкаў ВКЛ.

(Працяг у наступным нумары.)

Шаноўныя чытачы “Нашага слова”, ідучы ўслед за вашымі шматлікімі просьбамі мы прадаўжаем друк “Аповесці пра словы”. Хай сабе дзесьці і надалей гучаць выказванні, што ўсё, што выкладаецца ў нашай аповесці не зусім стыкуецца з дысертацыямі дактароў і кандыдатаў, але застаецца фактам, што “Аповесць пра словы” выклікала цікавасць нашых чытачоў, цікавасць да беларускага слова, яго гісторыі, а гэта магчліва, і ёсць самае галоўнае дасягненне, бо ад цікавасці пачынаецца ўсё астатняе: і навука, і дысертацыі. З цягам часу нехта нешта дадасць, нехта нешта абвергне, нехта правядзе даследванні, а калі ў выніку нашай аповесці народзіцца нават адно навуковае даследванне пра беларускую мову, то беларушчыны на свеце стане болей, а гэта і ёсць наша канцавая мэта. Беларушчыны павінна быць болей з кожным днём, з кожнай публікацыяй. А зараз “Аповесць пра словы”

Аповесць пра словы

КАСА

Каса

1. Ручная сельскагаспадарчая прылада, якая складаецца з доўгага загнутага ляза, насаджана на касільна і служыць для зразання травы збожжа і інш.

2. Зброя, якая мае шырокую рэзальную частку, шырокае лязо.

3. Доўгія заплеценыя валасы.

4. Доўгая, вузкая паўвысна, якая выступае ў мора ці возера.

5. Селязёнка.

1. Каса — прылада працы.

Пачнём з таго, што ў глыбокай старажытнасці косаў не было зусім. Не знойдзена ні адной каменнай касы ва ўсім свеце і ўявіць нават цяжка, як яна магла б выглядаць, скажам, крамянёвая каса, і як ёй касіць.

Н[е] давялося мне ні ў адной кніжцы па археалогіі, ні ў адным археалагічным зборы выявіць і бронзавую касу. Рабіць на грунце гэтага выснову пра тое, што і бронзавх косаў не было, мабыць не карэктна, але зрабіць выснову, што ў бронзавым веку косы былі, не маючы ні аднога факта, яшчэ цяжэй. І тэхналагічна бронзавая каса малаверагодная.

Таму каса хутчэй за ўсё з’явілася пасля адкрыцця жалеза. Пра гэта ўскосна сведчаць грэкі. Па-грэцку ***sideros*** — адначасова ***каса, серп, сякера, меч, сталь, жалеза***. Для сярпа ў іх ёсць і іншае слова, а вось слова ***жалеза-sideros*** прыменена да ўсіх асноўных прылад працы. Узнікла гэтае слова ад назвы народа ***дарыйцы (дорыйцы)***, якія ў 1300 годзе да нашай эры захапілі ўсю Грэцыю за кошт таго, што прыйшлі ўзброеныя жалезам. Захапіць то захапілі, але пераварыць не змаглі. Узнікла дарыйска-ахейская сумесь, дарыйска-ахейкая койнэ (трасянка), якую мы зараз называем старажытна- грэцкай мовай. Каса для грэкаў аказалася новай прыладай і проста жалезкай. Дарэчы ў Беларусі лязо гэбліка называюць ***жалязка***, прас (уцюг) таксама ***жалязка***.

Мы паспрабавалі паказаць, што да прыходу дарыйцаў (арыйцаў) грэкі не ведалі касы, але гэта не значыць, што дарыйцы яе ведалі на той час і прынеслі з сабой.

Мы паказалі, што тэхналагічна каса не магла з’явіцца раней, чым з’явілася жалеза, але пазней магла і ёсць праблема вызначыцца наколькі пазней. Каса магла з’явіцца толькі тады, калі ў ёй узнікла патрэба. Праблему жніва збожжа чалавек паспяхова вырашаў сярпом. Серп прылада вельмі старажытная і вядомая яшчэ з каменнага веку. Праблему касьбы травы чалавек не вырашаў ніяк. У месцах зараджэння старажытных цывілізацый: Егіпет, Вавілон, Малая Азія, Індыя траву не касілі. Паша тут круглагадовая. Праблемы нарыхтоўкі сена на зіму не існавала. З’яўленне касы маглі выклікаць толькі новыя ўмовы, толькі перамяшчэнне людзей у месцы, дзе жывёла не магла пасвіцца круглы год, г.зн. перамяшчэнне жывёлаводаў у зону глыбокіх снягоў. І тут першапачаткова задачу спрабавалі вырашаць сярпом. І слова ***сенажаць*** гэта водгук той далёкай пары.

Новае слова ***сенакос*** мусіла быць поўным сінонімам, але слова сенажаць законсервавалася, бо працэс жніва травы затух, а развіўся працэс касьбы і следам за працэсам развілося гняздо словаў.

Зыходзячы са сказанага мы павінны выказаць здагадку, што ў сілу таго што касьба ўзнікла пасля прыходу арыйскіх плямёнаў на поўнач, то лінгвістычнае абслугоўванне гэтага працэсу ў кожнага саюза плямёнаў фармавалася самастойна, а таму павінна вызначыцца вялікім рознабоем у фармаванні гнёздаў словаў для абслугоўвання касьбы.

Словаў ***каса, касьба, касец*** у санскрыце я пакуль што не знайшоў і не ўпэўнены, што яны там ёсць. Касьба ў Індыі практычнага сэнсу не мела, хаця ў больш позьнія часы магла і з’явіцца, магла быць занесенай. Калі мы лічым арыйскія плямёны, якія прыйшлі ў Індыю нашчадкамі хетаў, то і хетам не было ніякай неабходнасці нешта касіць. Жывёлагадоўля ў хетаў была напаўвандроўная па тэрыторыях, дзе снегу не бачылі.

Не касілі сена скіфы, хоць ім даводзілася жыць ужо ў зоне снягоў, але снягоў не глыбокіх і яны заўсёды маглі адвандраваць за мяжу снежнага покрыва.

Пра Грэцыю ўжо было сказана. Застаецца дадаць, што і мы з вамі у “Аповесці пра словы” і шматлікія гісторыкі ўжо разважалі і не раз пра слова ***жыта***. І выводзілі яго ад слова ***жыць***. Хаця пакуль само слова ***жыць*** мы не разглядалі.

І тут я мушу зрабіць невялікі дадатак да артыкула пра жыта. Справа ў тым, што ў грэцкай мове ёсць слова ***sitos*** (нажаль у кампутары няма грэцкага шрыфту, або я не ведаю, як яго знайсці, таму грэцкія словы вымушаны даваць у лацінскай транскрыпцыі). Дык вось слова ***sitos*** абазначае: ***зерне, пшаніца, жыта***. І ўжо зараз паўстае пытанне пра запазычанне. І калі славяне запазычылі насенне і культуру вырошчвання, то запазычылі і назву. Паколькі ў грэкаў слова ***sitos*** агульнаяльнае, акалагічнае нашаму ***збожжу***, а ў нас гэтае слова абазначае канкрэтную культуру, магчыма першую з асвоеных, то лагічна сказаць, што не грэкі ў нас, а мы ў іх гэтае слова запазычылі і лінгвістычна скрыжавалі са словам ***жыць***. Калі гэта так, то становіцца зразумелым і слова ***сіта***. Яно ад таго ж ***sitos***. Праз сіта сеялі жытнюю муку, а далей ідзе слова ***сетка***. Але гэта між іншым. У прынцыпе запазычання магло і не быць. І ***жыта*** і ***sitos*** маглі паходзіць ад агульнага інда-еўрапейскага слова, што ніколькі не абвяргае нашыя разважанні пра агульнасць і блізкасць беларускага ***жыта*** і грэцкага ***sitos***.

Але вернемся да касы. Каса спатрэбілася паўночным народам: кельтам, германцам, балтам, славянам. Усе гэтыя народы на момант асваення імі Еўропы ўжо былі жывёлаводамі, прынамсі ведалі культуру жывёлагадоўлі. Таму пытанне нарыхтоўкі сена паўстала даволі хутка і востра. І калі ў перыяд пацяплення ім удалося прасунуцца і замацавацца на паўночных тэрыторыях, то перыяд пахаладання паставіў пытанне прыстасавання, або адступлення. Адступаць не было куды, паўднёвыя землі былі заселены яшчэ болей шчыльна. Людзі пачалі нарыхтоўваць траву на зіму. Жаць яе было малаэфектыўна. Каса павінна была з’явіцца і яе прыдумалі. Хто і дзе? Гэта пытанне. Але асваенне кожнай групай народаў ішло самастойна і па сваіх законах. Я не маю доступу да кельцкіх моваў, таму гэтую групу прапусцім. Што тычыцца германцаў, то тут маем наступнае.

das Gras — трава, grasen — пасвіцца

die Landzunge, die Neh-rung, die Sense — усё гэта каса.

der Sichel — серп.

sehneiden, mahen,ernten, — жаць.

mahen, dahinraffen — касіць.

die Mahd — касьба.

der Sehitter — касец.

die Grasmahmaschine — сенакасілка

das Heu — сена.

der Henmahd, der Heuschlag — сенакос.

Серп стаіць асабняком.

Каса мае тры сінонімы, а з дыялектамі яшчэ больш.

Слова ***mahen*** — гэта і ***жаць*** і ***касіць***.

Слова ***ernten*** аднаго кораня са словам ***die Ernte — ураджай***.

Сена — зноў асабняком.

die Grasmahmaschine — машына, якая косіць траву.

Сенакос мае два сінонімы і ў абудва ўваходзіць слова ***сена***.

У выніку ніякай строгай сістэматызацыі не назіраецца. Архаічнае, безсістэмнае прыстасаванне розных словаў мовы да новага працоўнага працэсу. Аналагічна таму, як утвараюцца сучасныя неалагізмы кшталту: ***кустарэз, каменедрабілка*** і г.д.

Прыблізна тое самае мы бачым і ў іншых мовах.

Так у летувіскай мове таксама з’явілася новае слова адпаведна новай прыладзе працы; ***dalgis — каса***, але ад гэтага слова ўзнікла ўсяго тры сінонімы: ***dalgiakotis, dalgikotis, dalgykstis***, якія абазначаюць кассё, аналагічна як і ў беларускай мове дзяржак або тронца касы маюць назвы: ***кассё, касільна, касавільна*** і г.д. Астатнія словы з гэтага гнязда ўтвораны тут ад слова ***серп***, што з’яўляецца даволі лагічным ці ад слова ***жаць:piautuvac—серп, piauti — жаць, рэзаць, пілаваць, касіць, piaunamoji masina — жнявярка (жняярка), pianstikles — разак, sienapinte — сенажаць (сенакос), sienapiove — сенакасілка, sienantois—касец, pintynes—жатва, касавіца***. Заўважым, што ў адрозненне ад беларускай мовы ***серп*** і ***жаць*** тут аднаго кораня. І ўсе яны ўзыходзяць да дзеяслова ***рэзаць***. У летувіскай мове сістэмнасць гэтага гнязда словаў значна большая, што сама па сабе зразумела. Тут мы маем справу фактычна з мовай аднаго племені жэмайтаў. Пра аўкштайтаў таксама можна гаварыць, але з вялікім нацягам.

Што ж тычыцца германцаў, то іхняе мноства плямёнаў, безумоўна, павінна было даць вось такі роскід, які паступова “са свету па нітцы” сабраўся ў мову.

Ёсць праўда ў летувісаў і слова ***nukirsti —жаць, зжаць***. І яны раздзяляюць ***nukirsti — зжаць*** і ***nupiauti — скасіць***. Так ***nukirsti hektara kviecin —зжаць гектар пшаніцы***, а ***visas pievas nupiauti —скасіць усе лугі.*** Трэба меркаваць, што ***pukirsti*** — слова больш старажытнае, як і нашае жаць ***piauti —рэзаць*** развілося да значэнняў ***пілаваць, касіць, жаць*** значна пазней. У нас таксама дровы ***пілуюць*** і ***рэжуць***.

Пераходзячы да беларускай мовы і, наогул, да славянскіх мы павінны мець на ўвазе ўжо атрыманы досвед: ***серп*** і ***жаць*** — ранні перыяд культуры і мовы; ***каса*** і ***касіць*** — позні перыяд.

Серп стаіць асабняком. Палякі ўтварылі месяц ***серпень***. Магчыма яшчэ хто. Мая бабуля па першаму мужу была ***Сярпінская***. Але разгалінаванага гнязда словаў вакол ***сярпа*** няма. ***Серп*** слова аднаскладовае і архаічна старажытнае. Адзін дзеяслоў ***сёрбаць***, які сэнсова далёка адарваўся ад сярпа малюнка не мяняе.

Дзеянне, якое робіцца ***сярпом***, абазначылі дзеясловам ***жаць***, які ў сваю чаргу не мог быць старажытным, хоць і аднаскладовы. У індаеўрапейскіх мовах у старажытны перыяд не было гука ***ж***. Гэты дзеяслоў тады гучаў, як ***яць***, што абазначала ***браць***. Ад ***яць*** узнік дзеяслоў ***с’яць — сабраць***, які далей і даў ***з’яць (зняць)*** і ***жаць***.

(Працяг у наступным нумары)

Станіслаў Суднік.

Рэдактар Станіслаў Суднік

Заснавальнік:
ТБМ імя Францішка Скарыны.
Пасведчанне аб рэгістрацыі:
№ 83 ад 28 чэрвеня 1996 г.
Адрас рэдакцыі:
220005, г. Менск, вул. Румянцава, 13.
Адрас для паштовых адпраўленняў:
231300, г. Ліда-2, п/с 7.
E-mail: ns@lida1.lingvo.grodno.by

Рэдакцыйная рада:
Генадзь Бураўкін — старшыня, Людміла Дзіцэвіч, Сяргей Запрудскі, Аляксей Пяткевіч, Аляксей Рагуля, Аляксей Саламонаў, Павел Сцяцко, Алег Трусаў, Эрнэст Ялугін.

Аўтары нясуць поўную адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзенай інфармацыі.

Газета надрукавана ў Лідскай друкарні ўпраўлення грамадска-палітычнай інфармацыі і друку Гродзенскага аблвыканкама. 231300, г.Ліда, вул. Ленінская, 23.
Кошт па дамове. Газета падпісана да друку 12. 10. 98 г.
Наклад 3000 асобнікаў. Замова № 2408.
Падпісны індэкс: 63865.
Кошт падпіскі: 1 мес.- 12 000 руб., 3 мес.- 36 000 руб.